Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гарадзенскія праваабаронцы аштрафаваныя за ўдзел у Свіслацкім фэсце

17.12.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Гарадзенскія праваабаронцы Уладзімір Хільмановіч і Віктар Сазонаў

15 снежня ў судзе Ленінскага раёна Гародні скончыўся разгляд адміністрацыйнай справы актывіста БХД Сяргея Верамеенкі і праваабаронцаў Віктара Сазонава і Уладзіміра Хільмановіча. За ўдзел у традыцыйнай акцыі "Дзень памяці паўстанцаў 1863 года", якая праходзіла 30 кастрычніка ў Свіслачы, усе тры актывісты былі аштрафаваныя, паведамляе "Гарадзенская Вясна".

Паводле міліцэйскіх пратаколаў, яны бралі актыўны ўдзел у вулічным шэсці, тым самым парушыўшы ўсталяваны парадак правядзення масавых мерапрыемстваў, адказнасць за якое прадугледжана артыкулам 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях РБ. Справу вёў суддзя **Дзмітрый Бубенчык**, які на самым пачатку паседжання адхіліў хадайніцтва Уладзіміра Хільмановіча аб вядзенні судовага паседжання на беларускай мове. Хадайніцтва актывістаў, каб у суд выклікалі галоўных міліцэйскіх начальнікаў Свіслацкага РАУС **Валерыя Раманчука** ды **Рустама Вагабава** ў якасці дадатковых сведкаў па справе, таксама суддзя адхіліў.

Падчас двухгадзіннага паседжання суддзя асноўную ўвагу канцэнтраваў на высвятленні таго, хто быў галоўным арганізатарам мерапрыемства, а таксама таго, ці выкарыстоўвалі абвінавачаныя бел-чырвона-белы сцяг. Пры гэтым сведкі-міліцыянты на пытанні з боку абвінавачаных пра тое, чаму тыя падчас мерапрыемства былі не ў форме і ніяк не супрацьдзейнічалі так званаму парушэнню парадку, адказвалі, што гэта не ўваходзіла ў іх задачы. Такім чынам, аргументы актывістаў ў сваю абарону судом улічаны не былі, і суддзя прыняў бок міліцыянтаў.


У выніку паседжання Сяргей Верамеенка быў пакараны штрафам ў 15 базавых велічынь, што складае 315 рублёў, Віктар Сазонаў атрымаў 35 базавых велічынь (735 рублёў) і Уладзімір Хільмановіч мусіць выплаціць 40 базавых велічынь (840 рублёў).


Усе аштрафаваныя грамадскія актывісты маюць намер абскардзіць пастанову суддзі Ленінскага раёна Д. Бубенчыка ў касацыйным парадку.


Нагадаем, за ўдзел у Свіслацкім фэсце каля дзесяці чалавек пакараныя грашовымі штрафамі, некаторыя ўдзельнікі яшчэ чакаюць адміністрацыйных судоў.

Твитнуть










"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY